

# У бясконцасці

**Пайшла з жыцця Юлія Міхайлаўна Чурко — прафесар, доктар мастацтвазнаўства, заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі, былая салістка балета нашага Вялікага тэатра.**

Ёй было 88 гадоў — дзве васьмёркі, падобныя да харэаграфічных піруэтаў, што выпісваюць у паветры сімвал падвойнай бясконцасці. Сапраўды, усё яе жыццё было звязана з балетам. Невыпадкова яе апошняя кніга, выданне якой літаральна супала са смерцю аўтара, так і называецца — "Маё жыццё ў харэаграфіі". Хаця, калі разабрацца, гэта было не адно, а некалькі розных жыццяў, непарыўна звязаных адно з адным.

Ленінградка, яна паспела вырвацца з блакады на апошнім цягніку. І ўжо тады, зусім маленькай дзяўчынкай, апынулася ў эвакуацыі разам з беларускімі дзеячамі культуры, бо знакамітая народная артыстка Беларусі Аляксандра Нікалаева была яе роднай цёткай. Мінск пазнейператварыўся ў яе другую радзіму: тут яна скончыла харэаграфічную вучэльню, танцавала на сцэне. Але ж гэта толькі першае жыццё Юліі Міхайлаўны. Другое — балетная крытыка, шматлікія газетныя артыкулы, што сталі вынікам завочнага навучання на факультэце журналістыкі БДУ. Так-так, Чурко была першай артысткай балета не толькі ў нашай рэспубліцы — ва ўсім СССР, хто скончыў ВНУ, атрымаўшы другую прафесію. Трэцяй спецыяльнасцю стала даследаванне харэаграфіі ў розных яе іпастасях: балетнай класікі, народнага танца, мадэрну і contemporary. У гэтым адгалінаванні спадчыны Чурко — з добры дзясятак манаграфій, безліч навуковых артыкулаў, вялізны архіў беларускіх фальклорных танцавальных запісаў, назапашаны цягам шматлікіх паездак па краіне. І, вядома, педагагічная дзейнасць: менавіта Юлія Чурко стаяла ля вытокаў кафедраў харэаграфіі ва Універсітэце культуры і мастацтваў і Акадэміі музыкі.

Наступнай засвоенай прафесіяй стала стварэнне лібрэта і непасрэдная пастаноўка балета "Кругаверць" у суаўтарстве з Уладзімірам Івановым на музыку Алега Залётнева ў нашым Вялікім тэатры. А яшчэ адно жыццё — уласна пісьменніцкае: апавяданні, аповесці, п'еса, раманы, што праглынаюцца, быццам круты дэтэктыў. Прычым усе творы — на харэаграфічную тэматыку, пра людзей мастацтва, напісаныя бліскучым літаратурным стылем, з цікавымі пошукамі формы выкладання. Не губляючы гумару нават у самых складаных абставінах, яна жартавала, маўляў, на старонках кнігі можна прыдумаць новы балет, апісаць яго ідэальнае ўвасабленне, скласці на яго шэраг разнапланавых рэцэнзій і абмеркаванняў — гэта ж цудоўна!

Менавіта яна была першай, хто пачаў прафесійна аналізаваць творчасць Валянціна Елізар'ева. Менавіта ёй, а не якому-небудзь расійскаму даследчыку, была замоўлена манаграфія пра Барыса Эйфмана. Яе артыкулы ўпрыгожваюць амерыканскую энцыклапедыю танца, выданні Кітая, Чэхіі, краін блізкага замежжа. Пэўна, яна працягвае прыдумляць і цяпер — у душы, такой жа бясконцай, як харэаграфія.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**